# ПАЛІТАЛОГІЯ

Станаўленне і развіццё паліталогіі на Беларусі звязана з гіст. эвалюцыяй сусв. паліт. думкі, растучай роляй палітыка-ўладных адносін і механізмаў кіравання грамадствам. Погляды бел. мысліцеляў і асветнікаў, вучоных у галіне сац.-гуманіт. ведаў у той або іншай ступені адлюстроўвалі сусв. паліт. рэаліі: гуманіст. ідэі еўрап. краін, асаблівасці сац. ўладкавання і паліт. працэсаў у Кіеўскай Русі, ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Рас. імперыі і СССР. Па меры назапашвання ведаў і асэнсавання працэсаў трансфармацыі дзяржаўнасці і барацьбы за нац. незалежнасць у бел. паліт. думцы ўдакладняліся канцэптуальныя падыходы да тлумачэння палітыкі, характару ўзаемаадносін дзяржавы з асобай і грамадствам. Унутрана ўласцівая ёй паліт. талерантнасць, успрымальнасць да хрысц. гуманіст. ідэалаў, асветніцтва, дэмакр.-вызваленчага руху абумовілі яе арганічную адаптыўнасць да агульначалавечых каштоўнасцей і накіраванасць да нац. ідэнтычнасці, самабытнасці і суверэннасці бел. народа. Гэтыя рысы ўласцівы творчасці Ф.Скарыны, С.Буднага, Міколы Гусоўскага, В.Цяпінскага, М.Сматрыцкага, А.Філіповіча, Сімяона Полацкага, А.Волана, Л.Сапегі, В.Дуніна-Марцінкевіча, І.Страйноўскага, К.Каліноўскага, Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, дзеячаў нац. культуры найноўшага часу. Іх сац.-паліт. погляды і практычная дзейнасць былі накіраваны на сцвярджэнне гуманіст. ідэалаў дабра і справядлівасці, законнасці і правапарадку, арганізацыю грамадскага жыцця на прынцыпах сац. і нац. роўнасці, свабоды перакананняў, раздзялення ўлад, забеспячэння законных інтарэсаў і правоў грамадзян, у т.л. права валодання ўласнасцю.

Паліталогія як навука стала запатрабаванай бел. грамадствам толькі ў пач. 1990-х г., пасля набыцця Беларуссю статуса суверэннай дзяржавы. У 1992 групай вучоных, палітыкаў, журналістаў і бізнесменаў створаны Незалежны ін-т сац.-эканам. і паліт. даследаванняў, у 1993 заснаваны Мінскі НДІ сац.-эканам. і паліт. праблем, у 1996 — Ін-т сац.-паліт. даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Цэнтр сацыялагічных і паліт. даследаванняў БДУ. Супрацоўнікі гэтых установаў аналізуюць розныя аспекты функцыянавання паліт. сістэмы і развіцця паліт. працэсаў, іх уплыў на станаўленне дэмакр. асноў бел. дзяржаўнасці і ін-таў грамадз. супольнасці. Навук. даследаванні ў галіне паліталогіі каардынуюць Асацыяцыя паліт. навук і грамадская Акадэмія паліт. навук. Паліталогія выкладаецца студэнтам ВНУ як абавязковая дысцыпліна. У вядучых ун-тах краіны створаны кафедры паліталогіі. Выдаюцца калектыўныя (БДУ, Бел. эканам. ун-т, Гродзенскі ун-т, Бел. нац. тэхн. ун-т) і індывідуальныя (Н.М.Беляковіч, П.І.Бондар, Ю.П.Бондар, У.А.Мельнік) падручнікі і навуч. дапаможнікі па паліталогіі. Упершыню ў пед. практыцы на аснове інавацыйных тэхналогій распрацаваны і рэкамендаваны Мін-вам адукацыі Рэспублікі Беларусь вучэбна-метадычны комплекс па паліталогіі (П.І.Бондар, Ю.П. Бондар). Пры яе вывучэнні выкарыстоўваюцца інтэрактыўныя метады і прыёмы навучання (тэсціраванне, дыялог, дыскусіі, сітуацыйныя задачы, выступленні ў якасці лектара і інш.). У БДУ, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Рэсп. ін-це вышэйшай школы ажыццяўляецца падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі прафес. палітолагаў.

Тэарэт. праблемы паліталогіі, метадалагічныя падыходы да аналізу бел. дзярж. палітыкі даследуюць Н.А.Антановіч, А.М.Байчораў, Н.М.Беляковіч, П.І.Бондар, У.А.Мельнік, С.В.Рашэтнікаў, П.П.Украінец. Гісторыя і асаблівасці працэсу эвалюцыі грамадска-паліт. думкі Беларусі раскрываюцца ў працах А.Ф.Вішнеўскага, Т.І.Доўнар, У.М.Конана, І.Я.Навуменкі, С.А.Шалькевіча і інш. Прыярытэтным кірункам сац.-паліт. даследаванняў з'яўляецца вывучэнне перадумоў і тэндэнцый станаўлення бел. дзяржаўнасці, рэальнага ўплыву на працэсы нац. ідэнтыфікацыі дзярж.-паліт. ін-таў Кіеўскай Русі, ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Рас. імперыі, сав. ладу жыцця (І.А.Басюк, П.І.Брыгадзін, Ф.В.Кругалевіч, В.Ф.Слука, І.А.Юхо і інш.). Высвятляюцца стратэгічныя задачы і праблемы сучаснай дзяржаўнасці, духоўна-каштоўнасная сутнасць нац. ідэі, альтэрнатывы пераходнага грамадства (В.М.Абрамава, А.М.Данілаў, Л.Ф. Заіка, В.І.Карбалевіч, В.П.Оргіш, Т.С. Процька, П.Г. Чыгрынаў і інш.).

Вопыт і ўрокі канстытуцыйнага развіцця краіны ва ўмовах паліт. трансфармацыі асвятляюцца ў працах Р.А.Васілевіча. Вывучаюцца паліт. асновы фарміравання прававой дзяржавы і грамадз. супольнасці, перспектывы іх усталявання ў Беларусі (А.М.Дзенісенка, А.І.Манаеў, Н.В.Паўлава, Г.І.Сцяпанаў, Т.С.Процька, В.Г.Ціхіня, В.І.Шабайлаў), месца і роля ў структуры дэмакратыі паліт. партый і рухаў (У.А.Бабкоў, А.М.Бадулін, А.У.Баранава, І.В.Катляроў, М.В.Кузняцоў), правоў і свабод чалавека (Н.М.Беляковіч, А.Дз.Гусеў, І.І.Катляр, Л.Ф.Яўменаў). Комплексна даследуюцца працэсы паліт. мадэрнізацыі на Беларусі, назапашанага вопыту дзярж. буд-ва і кіравання, сучаснай геапалітыкі. Іх вынікі адлюстраваны ў працах Я.М.Бабосава, У.А.Бажанава,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

П.І.Бондара, Ю.П.Бондара, В.В.Бушчыка, У.П.Вараб'ёва, Н.П.Дзенісюк, Л.Я.Землякова, А.У.Матусевіча, П.Г.Нікіценкі, С.В.Рашэтнікава, А.А.Сакалоўскага. Патрэбнасцямі сац.-паліт. пераўтварэнняў і пераадолення негатыўных з'яў у духоўна-ідэалагічнай сферы абумоўлена з'яўленне шэрагу навук. прац па ідэалогіі бел. дзяржаўнасці (Я.М.Бабосаў, Л.В.Вартанава, А.С.Майхровіч, У.А.Мельнік, В.В.Шынкароў, Я.С.Яскевіч). У калект. выданні Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь «Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы» абазначаны прыярытэты і змест даследчага пошуку, канцэптуальныя падыходы да ідэалагічных мэт і задач пераходнага перыяду. У апошнія гады прадметам вывучэння становяцца праблемы эфектыўнасці дзярж. палітыкі, узровень дэмакратычнасці правячай і апазіцыйнай эліт, практыка рэалізацыі паліт. і грамадз. правоў і свабод, фактары і ўмовы, якія перашкаджаюць усталяванню прынцыпаў грамадз. супольнасці і прававой дзяржавы, узмацненню грамадскага кантролю ўлады.

*Літ.*: С о к о л С.Ф. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI — первой половине XVII вв. Мн., 1984; М а т у с е в и ч А.В. Политическая система: состояние и развитие. Кн. 1. Мн., 1992; Т и х и н я В.Г. Тернистый путь к правовому государству. Мн., 1995; Е в м е н о в Л.Ф. Тотальный кризис и права человека. Мн., 1996; Д а н и л о в А.Н. Власть и общество: Поиск новой гармонии. Мн., 1998; М е л ь н и к В.А. Республика Беларусь: власть, политика, идеология. Мн., 1998; Я г о ж. Политология. 4 изд. Мн., 2002; П а в л о в Н.В., С т е п а н о в Г.И. Гражданское общество и правовое государство. Мн., 1999; Р е ш е т н и к о в С.В. Политология в Республике Беларусь: теоретико-методологические и прикладные аспекты. Мн., 1999; Государственное управление: политика в действии. Мн., 2000; Р е ш е т н и к о в С.В., А н т о н о в и ч Н.А. Системный подход как методология анализа публичной политики. Мн., 2000; Б о н д а р ь П.И., Б о н д а р ь Ю.П. Политология: Учеб.-метод. комплекс. Мн., 2003; П а д о к ш ы н С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. Мн., 2003.

*Ю.П.Бондар.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ